# Ф.А. КУДРЫНСКІ АБ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦІ НАВУЧАННЯ

***Н.Д.Паршута***
Навуковы кіраўнік –д.п.н., прафесар ***В.У.Буткевіч***
*Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка*

Значны ўклад у развіццё прагрэсіўнай педагагічнай думкі пачатку XX ст. унёс беларускі педагог Фядот Андрэевіч Кудрынскі (Багдан Сцепанец; 1867 – 1933). За сваё жыццё беларускі асветнік напісаў вялізарную колькасць крытычных артыкулаў, прысвечаных школе, настаўніку, адукацыі і выхаванню. Сярод іх вялікай ўвагі заслугоўваюць працы па пытанню індывідуальнасці навучання.

У артыкулу, які так і называецца "Аб індывідуальнасці навучання", Ф.А.Кудрынскі адзначаў, што індывідуальныя рысы характару дзіцяці ў працэсе навучання праяўляюцца ўжо с першых урокаў. Разам з тым, індывідуальныя асаблівасці волі і пачуццяў праяўляюцца не так хутка, як разумовыя асацыяцыі і схільнасці. [2].

З жалем беларускі педагог расказваў аб настаўніках, якія скардзяцца на непаспяваючых і няздольных дзяцей, на цяжкасць працы з імі. "Калі такое здараецца, – пісаў Ф.А.Кудрынскі, – гэта яшчэ не азначае аб няздольнасці вучня наогул, ... а толькі азначае няздатнасць да засваенню прадметаў, выкладаемых у школе. Вельмі магчыма, што ў яго прыродзе знаходзяцца здольнасці, якіх школа яшчэ не змагла адкрыць" [3 ; 207]. Ф.А.Кудрынскі сцвярджаў, што ў кожнага чалавека ёсць прызванне да чаго-небудзь. Беларускі асветнік упэўнены, што кожны настаўнік можа знайсці сродак для ўплыву на сваіх вучняў, як добрых, так і дрэнных. "Выявіць дар прызвання дзіцяці і прыкласці ўсе сродкі да яго развіцця – найважнейшая задача педагогікі", – падкрэсліваў Ф.А.Кудрынскі [3; 207].

Таму Ф.А.Кудрынскі заклікаў настаўнікаў быць больш пільнымі да вучняў, асабліва да непаспяваючых, якія маюць ва ўвазе настаўніка вялікую патрэбу. "Пагарджаць адстаючымі вучнямі, пакідаць іх без усялякай дапамогі ... вялікая памылка з боку выкладчыка. Такая сістэма супярэчыць ідэі справядлівасці і роўнасці" [2; 276]. Ф.А.Кудрынскі сцвярджаў, што настаўнік павінен імкнуцца аблегчыць працу малаталенавітым вучням, усяліць ім веру ў сябе і свае сілы і тады ў навучанні паявяцца поспехі і радасць. У доказ сказанаму педагог прыводзіць прыклады аб няздатных вучнях, якія пасля звяртання належнай ўвагі на іх настаўніка, нечакана развіваюцца і нават апярэджваюць больш здольных вучняў [2; 276].

Згаджаючыся з рускім педагогам П.Ф.Капцеравым аб неабходнасці прыстасоўвання метадаў навучання да індывідуальных асаблівасцей вучняў, Ф.А.Кудрынскі заўважаў, што гэтага яшчэ не дастаткова. На думку беларускага педагога, трэба неадкладна высветліць спецыяльныя практычныя метады індывідуальнасці навучання [2; 275].

У заключэнні трэба адзначыць, што пытанне індывідуальнасці ў працэсе навучання з'яўляецца актуальнай праблемай. Таму знаёмства з педагагічнай спадчынай выдатнага беларускага педагога Ф.А.Кудрынскага мае не толькі гістарычную, але і практычную цікавасць.

**Літаратура:**

1. Трухан А. В. Федот Андреевич Кудринский: Антология педагогической мысли Белорусской ССР/АПН СССР; Сост. Э.К.Дорошевич, М.С.Мятельский, П.С.Солнцев. М.: Педагогика, 1986. – С. 242 – 258.

2. Степанец Богдан. Об индивидуальности обучения // Народное образование в Виленском учебном округе . – 1902. – № 3. – С. 274 – 276.

3. Степанец Богдан. О воспитании и обучении: Важность и цель воспитания // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1911. – № 3. – С. 201 – 211.